жанчынай. Сітуацыя непаразумення галоўных герояў падаецца недарэчнай, таму што кожны з іх у сваіх думках разважае пра каханне да партнёра. Яны абодва ўзгадваюць моманты, якія выклікаюць адчуванне найбольшай пяшчоты ў іх душах.

Адносіны паміж усімі героямі твораў Адама Глобуса не заснаваны на духоўнай блізкасці, таму яны не могуць знайсці і адчуць паразуменне з боку іншага чалавека, што выклікае адчуванне абсалютнай замкнёнасці ва ўласным унутраным свеце. Трэба адзначыць, што пісьменнік не знаходзіць вырашэння дадзенай праблемы і пакідае герояў у стане абсалютнай адзіноты.

ЛІТАРАТУРА

1 Акудовіч, В. Уводзіны ў новую літаратурную сітуацыю / В.Акудовіч // http://knihi.com/frahmenty/8akudovich.htm

2 Бельскі, А. “Да глыбіняў жыцця”: маладая беларуская проза 80 – пачатку 90х гг: А. Асташонак, А. Асташонак, А. Глобус, А. Федарэнка, А. Казлоў. /А. Бельскі // Роднае слова. – 1992. – №5. – С. 56– 62

3 Глобус, А. Адзінота на стадыёне: Апавяданні / А. Глобус. – Мн. : Маст. літ., 1989. – 135 с.

***І. А. Бажок (Беларусь)***

## ІНТЭЛЕКТУАЛЬНАЯ ПАЭЗІЯ ІГАРА БАБКОВА

Ігар Бабкоў належыць да таго пакалення беларускіх пісьменнікаў, якіх В. Акудовіч назваў “базавым корпусам” першай хвалі беларускага інтэлектуалізму” [1, с. 275]. Паэт, эсэіст, філосаф метафізічнага мыслення, галоўны рэдактар часопіса “Фрагмэнты” І. Бабкоў здолеў рэалізаваць у сваіх творах інтэлектуальныя ідэі, якія фарміраваліся ад пачатку і да канца XX стагоддзя. Пра гэта сведчаць і словы самаго І. Бабкова наконт крыніц і межаў беларускай паэзіі: “Паэтычны космас Беларусі – замкнутая сфэра. Зямля – Колас. Нябёсы – Купала. Патаемная сярэдзіна, сутнаснае ядро – Багдановіч. Усе разам яны ўтвараюць сьвет прадвызначанае гармоніі” [2]. Тым не менш, сэнсавы бок паэзіі І. Бабкова звернуты да пошуку ўласна-аўтарскай гармоніі – спакою, цішыні, утаймаванасці, разважлівасці, стрыманасці. Інтэлектуалізм у паэзіі выявіўся ў першую чаргу ў супрацьстаянні “слова – пачуцце”. Лірычны герой пастаянна задумваецца аб мяжы паміж пачуццямі і словамі, спрабуе спыніць эмоцыі, але слова аказваецца няздольным матэрыялізаваць настрой, тон, стан душы. Вера ў перамогу інтэлектуальнага над пачуццёвым у І. Бабкова, безумоўна, ёсць: свет становіцца невыносным для існавання, і “Недзе там, незваротна // Абуджаецца слова” [3, с. 20]. Слова – яскравая надзея і ключ да гармоніі. Слова выглядае адзінокім вандроўнікам у сваёй барацьбе за інтэлектуалізм, слова персаніфікуецца, атаясамліваецца з асобай лірычнага героя:

І самотнае слова, шукаючы горкі спакой
З шчыльных камор трапляе ў сьвет неаглядна-
сукрыты [3, с. 42].

Часта клопаты аб слове перарастюць у пяшчотную ахову яго пачуццямі. Эмоцыі не змагаюцца са словамі, а, наадварот, спрабуюць выратаваць іх:

Пакутныя шкляныя сховы
Ў якіх прытушаныя словы
Дарма хаваюць вей цяжар
Унікнуць хочацца, ўмаліць
У далонях трапяткія гукі [3, с. 50].

Пераход ад пачуццяў да слоў часта вельмі нечаканы. Так, у вершы “Гарбаты кубак золатапраменны…” аўтар, захоплены эмоцыямі, адмаўляецца ад слоў і адразу ж атаясамлівае іх з неад’емным атрыбутам жыцця, яго “ласкавымі прадвеснікамі”:

Пах у душы і не патрэбны словы
А словы бы цьвікі сьветабудовы [3, с. 51].



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Слова набывае сімвалічны сэнс, пад ім падразумяваецца магчымасць гаварыць увогуле, гаварыць удумліва, асэнсавана. Вельмі яскрава, запамінальна І. Бабкоў сцвярджае ідэйную сутнасць слова:

птушкай сьляпой
слова выпала з губ [3, с. 53].

Акрамя "маўклівага", песімістычнага шляху да інтэлектуалізму аўтар прапануе і проста канстатаваць той факт, што душа (а гэта значыць пачуцці) ёсць "фрагмэнт непрачытаных слоў" [3, с. 67]. Апошні спосаб не дае магчымасці выбару, усе пачуцці – гэта словы, толькі не названыя.

У пошуку шляхоў да інтэлектуалізму аўтар прыходзіць да высновы, што не толькі жыццё – сон, але і словы – таксама сон. Знаходзячыся ў памежнай сітуацыі (характэрнай для экзістэнцыялізму) лірычны герой І. Бабкова са здзіўленнем зазаначае:

знаходжу цябе сярод сноў
але не знаходжу
тут
сярод словаў [3, с. 87].

Самым дзейсным і надзейным аказваецца шлях інтэлектуальнага пошуку. Герой верша "Зіма" адчайна знаходзіць месца слову з дапамогай геаграфічнай мапы. Зіма скавала не толькі пачуцці ("сэрца – сляпы камяк"), але і думкі ("схаладзелы розум"). Безнадзейнасць мяжуе з упартасцю і адчаем:

Словы шукаюць сэнсу, нібы ў пустэчы
Вады.
І апошні радок, сягаючы за далягляд,
Бязлітасна і навосьлеп шукаючы слова,
Адчайна, усьцешана – прымае лад
Вечнасці. Зімовага схова [3, с. 90].

Відавочна, што словы аддзеленыя сцяной, за якой апынуліся разам сэнс і пачуцці. Гісторыя барацьбы слова заканчваецца тым, што яно памірае, а апошнія яго спадарожнікі – цяжар і пяшчота. Душа пакутуе ад адзіноты і разгубленасці, блукае на зямлі.

Галоўнымі філасофска-інтэлектуальнымі паняццямі ў светапоглядзе І. Бабкова з'яўляюцца празрыстасць, утаймаванасць і дасканаласць.

Дасканаласць – тое, да чаго імкнецца кожны чалавек, але і дасканаласць у кожнага свая. У І. Бабкова – гэта ідэальная прастора, "краіна Чыстай Зямлі" [3, с. 30]. Пад празрыстасцю падразумяваецца якасць такой прасторы, у якой няма месца пачуццям, яны першыя трапляюць у прадонне празрыстасці. Зруйнаванае шматлікімі эксперыментамі XX стагоддзя, мастацкае поле чакае свайго "героя вайны за празрыстасць". Каб дасягнуць пэўнай мэты, неабходна ўтаймавацца. Утаймаванасць – найлепшы шлях, спосаб дасягнення ідэалу. І. Бабкоў змяшчае ў дзіцячай калысцы "пакутны сьвет і цішыню гарбаты" [3, с. 40].

Лірычнаму герою пастянна нечага не хапае. Магчыма таго, што схавана сярод пачуццяў. Заклікі і просьбы, звернутыя да "ашалелага" сэрца ("сэрца ўтойся, маўчы", "сэрца, цішэй" [3, с. 16]), не застаюцца без увагі. Сэрца становіцца халодным прытулкам, на месцы жаданняў узнікае пустэча. Сваю ролю вечнай гаспадыні жыцця адыгрывае мудрасць:

халоднае лямпы сьвятло
і словы кладуцца незваротным узорам
дзе дом твой, мудрасьць? Адкуль
дарогі твае і куды [3, с. 26]?

Той, хто шукае, заўсёды знойдзе. Таму "герою вайны за празрыстаць" дадзена мудрасць.

Паэзія І. Бабкова – сцвярджэнне інтэлектуалізму ў беларускай літаратуры. У вершах яскрава праявіліся першыя спробы грунтоўнага асэнсавання рэчаіснасці праз разумовы бок жыцця, метафізічнае мысленне дазваляе паглядзець на рэчы і з'явы статычна. Па словах аўтара, "мысьленне выяўляе сваю прысутнасьць, закінутую ў прастору сучаснасьці. Яно знаходзіць сябе тут… І пачынае ўглядацца ў тое, што вакол нас. Яно імкнецца выявіць і

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

тэматызаваць зьместы, што насяляюць гэтую прастору. І ў той момант, калі яно зьвяртаецца да “саміх рэчаў”, спрабуе ўбачыць і асэнсаваць іх, яно чуе голас, які цьвердзіць, што рэчы навакольля, тое, што для нас ёсьць сучасным і прысутным, насамрэч, у нейкай апошняй, універсальнай перспектыве – ўжо прамінулі” [4]. Як бачна, не толькі ў паэзіі, але і ў тэарэтычных выкладах І. Бабкова відавочны пошук нечага ідэальнага, канкрэтнага. Пісьменнік выбірае для сябе адзін са шляхоў пазнання – інтэлектуальны, выяўляючы тым самым магчымасці літаратуры такога кшталту.

ЛІТАРАТУРА


1 Акудовіч, В. Разбурыць Парыж / В. Акудовіч. – Мн.: Логвінаў, 2004. – 298 с.

2 Бабкоў, І. Паэзія – практыкаванні ў хаосе / І. Бабкоў [Электрон. рэсурс]. – Рэжым доступу: htt://www.litara.net

3 Бабкоў, І. Герой вайны за празрыстасць / І. Бабкоў. – Мн.: БГАЦК, 1998. – 92 с.

4 Бабкоў, І. Постсавецкія інтэлектуалы, “універсальнасць” і “Заходні канон” / І. Бабкоў [Электрон. рэсурс]. – Рэжым доступу: htt://www.litara.net.



***Т.А. Бандарчук (Беларусь)***


## КАТЭГОРЫЯ ШЧАСЦЯ Ў ФРЭСКАХ БАРЫСА ПЯТРОВІЧА

Творчасць Барыса Пятровіча звязана з узнікненнем новай малой празаічнай формы ў беларускай літаратуры. Яго фрэскі, знешне не звязаныя паміж сабой, маюць тым не менш глыбокую унутраную ўзаемасувязь, якая заснавана на матыве пошуку сэнсу жыцця. Гэта праявілася ўжо ва ўступе да зборніка “Жыць не страшна: фрэскі”, дзе аўтар вывеў і растлумачыў уласную формулу шчасця: “Жыццё ёсць найвялікшая выпадковасць, якая магла не стацца. І для кожнага асабіста і для чалавецтва ў цэлым- аб-са-лют-на-я вы-пад-ко-васць, збег абставінаў, якія маглі не скласціся, не быць. І трэба радавацца, што гэта здарылася, калі гэта здарылася… Вось так… Ад шчасця быць- не адмаўляюся: для мяне любое быць- шчасце: птушкай, травінкай, мурашом, тым болей- чалавекам… Ну а заставацца ў часе – шчасце ўдвая” [1, с.8].

Кожны з герояў фрэсак Барыса Пятровіча займаецца пошукам сэнсу жыцця. Для адных шчасце- задавальненне ўласных жаданняў, якія потым змяняюцца жаданнем жыць разам, каб не быць адзінокімі: “… “Жыць разам?-падумаў Саша. – А, можа, гэта і сапраўды самае мудрае выйсце: жыць разам…”- і адказаў:

-Давай” [1, с.14].

Іншыя, як напрыклад, Андрэй з фрэскі “Флі-бус…”, бачаць шчасце ў тым, каб мець гучнае і прэстыжнае імя. А для кагосьці шчасце- проста выхадны дзень, праведзены з пляшкай гарэлкі, калі ты задаволены сабой і не адчуваеш сябе нікчэмным і непатрэбным. Але такое “шчасце” бывае рэдка, часцей усё здараецца наадварот (фрэска “Пралёт”).

Але разгледзеўшы ўсе магчымыя варыянты, Барыс Пятровіч прыходзіць да заканамернай высновы: “… сэнс жыцця ў тым, каб жыць”, што сугучна са словамі пісьменніка ва ўступе да зборніка фрэсак [1, с.87].

Праблему творцы пісьменнік вырашае як у рэальным свеце, так і па-за рэальнасцю. Аўтар сцвярджае, што “паэтычным можа быць усё: і росная ружа, і слізкая жаба, і халодны паравоз, і гарачы конь. Трэба толькі, каб душа словы знайшла, каб прыгожа апранула думкі. А гэта альбо дадзена чалавеку ад нараджэння, альбо- не” [1, с.18]. А штуршком да творчасці можа стаць любая неспадзяваная сустрэча, няхай і не вельмі прыемная (фрэска “Сустрэча”).

Адметнасць некаторых фрэсак Барыса Пятровіча- настальгія па мінуламу, сваёй маладосці, калі цябе нішто не задавальняе, калі хочацца змяніць усё, калі “зазіраючы ў будучыню, бачыў сябе лаўрэатам Нобеля, ня меней” [1, с.19]. Успаміны мінулага не сумныя і трывожныя, а хутчэй радасныя, з нейкім шкадаваннем таго, што ўжо ніколі не паўторыцца:



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ